Дзеці — гэта інтэлектуальны капітал кожнай нацыі. Таму дадзеная праблема ў цеснай узаемасувязі з іншымі становіцца дзяржаўнай, першачарговай. Паказальным для нас тут з'яўляецца вопыт замежных краін, якія сутыкнуліся з гэтай праблемай раней за нас і ўжо маюць пэўны вопыт і напрацоўкі па дадзеным пытанні. Да прыкладу, магутныя дзяржаўныя праграмы падтрымкі дзіцячага чытання і кнігавыдання для дзяцей створаны і эфектыўна функцыянуюць каля трыццаці гадоў у Нарвегіі, Польшчы, Славакіі, Францыі і іншых краінах Заходняй Еўропы. У Расіі створана і трэці год дзейнічае праграма "Дзеці Расіі".

У нашай дзяржавы яшчэ наперадзе распрацоўка планаў і праграм, накіраваных на вырашэнне ўказанай праблемы.

**Прадзеіна А.В.,**
аспірантка кафедры
бібліяграфіі і дакументазнаўства

## СІСТЭМА РЭГІЯНАЛЬНЫХ БІБЛІЯГРАФІЧНЫХ ДАПАМОЖНІКАЎ: СУЧАСНЫ СТАН, ПЕРСПЕКТЫВЫ РАЗВІЦЦЯ
(на прыкладзе абласных універсальных бібліятэк Беларусі)

Абласныя універсальныя навуковыя бібліятэкі Беларусі з'яўляюцца цэнтрамі краязнаўчай бібліяграфічнай дзейнасці ў вобласці (рэгіёне). У адпаведнасці з "Палажэннем аб краязнаўчай рабоце бібліятэк Рэспублікі Беларусь" (1993 г.) яны павінны весці самы поўны і дакладны краязнаўчы даведачна-бібліяграфічны апарат, займацца краязнаўчым бібліяграфічным абслугоўваннем, распаўсюджваць краязнаўчыя веды, фарміраваць сістэму краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў і паказальнікаў мясцовых дакументаў, разгляду якой і прысвечаны дадзены артыкул. Станоўчым момантам з'яўляецца тое, што ў разглядаемым дакуменце ўпершыню паказальнікі мясцовага друку, не звязаныя па змесце з краем, аднесены да статусу краязнаўчай дзейнасці бібліятэк, аб чым

Рэпазіторый БГУКІ

сведчыць факт іх знаходжання ў Палажэнні. У сістэме краязнаўчай бібліяграфічнай інфармацыі вылучаны дзве падсістэмы: 1) бібліяграфічныя дапаможнікі аб краі; 2) бібліяграфічныя паказальнікі мясцовых дакументаў. У першай падсістэме, у сваю чаргу, вызначаны такія віды бібліятэчных дапаможнікаў (па змесце аб'екта), як універсальныя, галіновыя, тэматычныя, персанальныя і біябібліяграфічныя, па храналагічнай прымеце — бягучыя, рэтраспектыўныя, а таксама паказальнікі краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў. Другая падсістэма, наадварот, чамусьці абмежавана толькі паказальнікамі кніг, перыядычных выданняў і іх зместу, хоць вядома, што існуюць і могуць складацца не толькі друкаваныя бібліяграфічныя крыніцы мясцовых дакументаў.

Уважлівы аналіз прапанаванай у Палажэнні сістэмы бібліяграфічных дапаможнікаў сведчыць аб тым, што, па-першае, ёсць лагічная недакладнасць у назве падсістэм. Першая з іх мае назву "Бібліяграфічныя паказальнікі аб краі", якая з'яўляецца агульнай для дзвюх падсістэм. На самай справе, няўжо бібліяграфічныя паказальнікі мясцовых дакументаў не сведчаць аб развіцці сродкаў масавай інфармацыі ў краі? Больш таго, змест артыкулаў, надрукаваных у мясцовым перыядычным друку, як сведчаць даследаванні, прысвечаны па змесце менавіта пэўнаму рэгіёну. Па-другое, калі ў Палажэнні рэкамендуюць дакладна вылучаць два віды паказальнікаў — краязнаўчых і мясцовых дакументаў, дык заканамерна ўзнікае пытанне аб агульным паняцці для сістэмы цалкам. У якасці такога, як мы лічым, можа выступаць тэрмін "сістэма рэгіянальных бібліяграфічных дапаможнікаў". На працягу доўгага часу сярод тэарэтыкаў і практыкаў бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства існавалі спрэчкі аб аднясенні бібліяграфічных дапаможнікаў мясцовых выданняў да краязнаўчых. Сучасныя дасягненні ў галіне тэорыі інфармацыі дазваляюць навукова абгрунтаваць узаемасувязь і спецыфіку дакументаў, якія па змесце тычацца пэўнага рэгіёна, і мясцовых дакументаў, не

звязаных па змесце з краем. Як вядома, прыхільнікі атрыбутыўнага падыходу да інфармацыі вылучаюць у яе складзе два віды апошняй: сацыяльная інфармацыя (у нашым выпадку па змесце адносіцца да краю, бо суб'екты, людзі яе асэнсавалі) і патэнцыяльная інфармацыя, закладзеная ў форму дакументаў як фізічных з'яў. Менавіта гэтая спецыфіка ўласцівая дзвюм падсістэмам бібліяграфічных дапаможнікаў. Так, аналіз суб'ектамі паказальнікаў мясцовых дакументаў дазваляе вылучыць такія пытанні, як стан кнігавыдавецкай справы ў рэгіёне, паліграфічнай прамысловасці, распаўсюджанасць сродкаў масавай інфармацыі, выяўленчага мастацтва, асабліва кніжнай графікі і інш. Публікацыі па дадзенай праблематыцы, зробленыя з дапамогай аналізу мясцовых выданняў, як бы набываюць ужо статус сацыяльнай інфармацыі і адносяцца да краязнаўчых. У культуралогіі гэты феномен атрымаў назву артэфакта.

Самым галоўным недахопам сістэмы бібліяграфічных дапаможнікаў, прапанаванай у Палажэнні, з'яўляецца тое, што ў ёй адсутнічае дыферэнцыяцыя іх па грамадскім прызначэнні, якое з'яўляецца сукупным паняццем мэтавага і чытацкага прызначэння дапаможніка.

Улічваючы патрабаванні Палажэння да відавой структуры сістэмы рэгіянальных бібліяграфічных дапаможнікаў, прааналізуем рэальны яе стан.

Разгледзім першую падсістэму, якая павінна адлюстроўваць краязнаўчыя дакументы (храналагічныя рамкі аналізу дакументаў пачынаюцца з 1994 года, калі ўступіла ў дзеянне прынятае ў снежні 1993 г. разглядаемае Палажэнне). Пры фарміраванні гэтай падсістэмы першапачатковай задачай з'яўляецца складанне асноўнага сістэмаўтваральнага звяна — універсальных паказальнікаў (бягучых і рэтраспектыўных). Найбольш поўна прадстаўлена звяно навукова-дапаможных універсальных бягучых дапаможнікаў. Усе абласныя бібліятэкі Беларусі рыхтуюць іх у аўтаматызаваным рэжыме і здзяйсняюць выданне штоквартальных паказальнікаў новай краязнаўчай

літаратуры, акрамя Гомельскай абласной бібліятэкі, якая выдае інфармацыйны бібліяграфічны паказальнік “Новая літаратура аб Гомельшчыне” раз у год. На жаль, да сённяшняга часу адсутнічае рэтраспектыўны універсальны паказальнік аналагічнага віду, які б забяспечваў навукоўцам і іншым групам карыстальнікаў рэтраспектыўны пошук. Аднак калі прытрымлівацца пункту погляду некаторых навукоўцаў наконт таго, што штогоднікі “Літаратура аб вобласці за ... год”, якія затрымліваюцца з выхадам у свет на два, тры і больш гадоў, рэальна паведамляюць аб выданнях мінулых гадоў і выконваюць падагульняючую функцыю, у гэтым выпадку прыкладамі рэтраспектыўнага універсальнага навукова-дапаможнага паказальніка з’яўляюцца гомельскі штогоднік і штоквартальнікі, якія з цягам часу можна выкарыстоўваць як крыніцы рэтраспектыўнага пошуку.

Але, на наш погляд, гэта не выхад са становішча, таму што бібліяграфічны пошук пры такім падыходзе вельмі доўгі, неэфектыўны. Трэба складаць універсальныя рэтраспектыўныя бібліяграфічныя паказальнікі, якія ўяўляюць базу для ўсёй краязнаўчай працы, інфармуюць аб вывучанасці рэгіёна цалкам ці ў якіх-небудзь аспектах, адлюстроўваючы дакументы за храналагічна вялікі перыяд. А калі весці размову аб тым, што абласная бібліятэка з’яўляецца асноўным інфармацыйным цэнтрам рэгіёна і павінна быць апошняй інстанцыяй пры выкананні складаных краязнаўчых даведак, патрэбна ствараць зводныя друкаваныя каталогі краязнаўчых дакументаў, у якіх бы адлюстроўваліся і архіўныя матэрыялы.

Звяно навукова-дапаможных шматгаліновых рэпертуарных краязнаўчых дапаможнікаў прадстаўлена бібліяграфічным спісам “Эканоміка, сельская гаспадарка, ахова здароўя на Гродзеншчыне ў 1994 годзе” (Гродна, 1994), паказальнікам “Магілёўшчына ў творах мастацтва і мастацкай літаратуры” (Магілёў, 1995), галіновых — “Прырода роднага краю” (1996), тэматычных — “Помнікі і памятныя мясціны Магілёўшчыны” (1995), “Тэатральная

творчасць Магілёўшчыны" (1997), якія выдадзены Магілёўскай абласной аб'яднанай бібліятэкай імя У.І. Леніна. Вельмі добра прадстаўлена і звяно персанальных і бібліяграфічных дапаможнікаў (паказальнікаў і слоўнікаў). Асабліва шмат цікавага і ў гэтым накірунку зрабіла Магілёўская абласная бібліятэка. Ёй складзены наступныя бібліяграфічныя паказальнікі: "Выдатныя дзеячы музычнага мастацтва Магілёўшчыны" (1994), "Даследчыкі роднага краю (краязнаўцы і гісторыкі-ўраджэнцы Магілёўшчыны)" (1995), "Географы і геолагі-ўраджэнцы Магілёўскай вобласці" (1995), а таксама біябібліяграфічны слоўнік "Сучасныя мастакі Віцебшчыны" (1994) Віцебскай абласной бібліятэкі.

Звяно універсальных рэкамендацыйных бягучых паказальнікаў прадстаўлена рэкамендацыйнымі спісамі "Аб Віцебшчыне пішуць", які выходзіць раз у год, штоквартальнікам "Аб Брэстчыне пішуць". Нягледзячы на тое, што ў "Міжведамасным каардынацыйным плане падрыхтоўкі бібліяграфічных дапаможнікаў у БССР на 1991—1995 гады" (Мн., 1990) было запланавана выданне універсальнага рэтраспектыўнага паказальніка тыпу "Што чытаць аб краі" (вобласці, раёне) усімі абласнымі бібліятэкамі Беларусі, у разглядаемы храналагічны перыяд гэтае звяно прадстаўлена толькі выданнямі "Ахова здароўя" (1995), "Гісторыя вёсак" (1997) Магілёўскай абласной бібліятэкі, якая пад назвай "Што чытаць аб краі" пачала рыхтаваць серыю з трох галіновых бібліяграфічных паказальнікаў ("Ахова здароўя", "Гісторыя вёсак", "Народная асвета"), што не адпавядае патрабаванням да гэтага віду паказальнікаў.

Звяно галіновых (рэтраспектыўных) краязнаўчых дапаможнікаў прадстаўлена наступнымі бібліяграфічнымі паказальнікамі: "Мастацтва на Гродзеншчыне" (1994), а тэматычных — "Гродзенскай абласной навуковай бібліятэцы імя Я.Ф. Карскага — 165 гадоў" (1995), а таксама бібліяграфічнымі спісамі: "Витебский район в годы Великой Отечественной войны" (1995), "История



Репозиторий БГУКИ

создания Полоцкой милиции" (1996) Віцебскай абласной бібліятэкі і "Палессе, якога мы не ведаем" (пра фотаэтнаграфічную выставу), "Першы міжнародны тэатральны фестываль "Белая вежа", "Першы нацыянальны фестываль беларускіх фільмаў", складзеныя ў 1997 годзе Брэсцкай абласной бібліятэкай.

Звяно праблемна-комплексных бібліяграфічных дапаможнікаў складаюць бібліяграфічныя дапаможнікі тыпу "Каляндар знамянальных і памятных дат", якія выдаюцца ўсімі абласнымі бібліятэкамі Беларусі і па змесце адносяцца да канкрэтнага рэгіёна, а таксама штомесячным бібліяграфічным спісам краязнаўчых матэрыялаў "Чарнобыль", які складаецца супрацоўнікамі Брэсцкай абласной бібліятэкі. На нашу думку, зыходзячы з таго, што назва гэтага дапаможніка дубліруе назву бягучага навуковадапаможнага паказальніка, які выдаецца Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі, трэба было б удакладніць яе тапонімам, напрыклад, "Чарнобыль і Гродзеншчына". Звяно рэкамендацыйных персанальных і бібліяграфічных дапаможнікаў уяўляецца наступнымі бібліяграфічнымі спісамі: "Литература о художнике Ю.М. Пэне" (за 1960—1995 гг.), які выйшаў у 1995 годзе ў серыі "Нашы землякі — дзеячы мастацтва" Віцебскай абласной бібліятэкі, "Публікацыі А.Д.Стадуба, журналіста "Лідскай газеты" (1996) Гродзенскай абласной бібліятэкі. Серыя "Пісьменнікі-землякі" Мінскай абласной бібліятэкі прадстаўлена лістоўкамі-закладкамі "Што чытаць далей" па кнігах беларускіх пісьменнікаў да іх юбілейных дат (Г.Далідовіча, М.Гіля, К.Цвіркі і іншых), а таксама "Памяць мастака М.М.Селешчука", "Узнаўленне Крыжа Ефрасінні Полацкай брэсцкім мастаком М.П.Кузьмічом", "Фарбы кахання Наталлі Чорнагаловай" (пра брэсцкую мастачку), якія выдадзены ў 1997 годзе Брэсцкай абласной бібліятэкай.

Другая падсістэма агульных бібліяграфічных паказальнікаў мясцовых дакументаў і паказальнікаў іх зместу можа быць прадстаўлена толькі раздзелам "Бібліяграфічныя

Рэпазіторый БДУКіМ

паказальнікі” дапаможніка Гомельскай абласной бібліятэкі “Выданні Гомельскай абласной аб’яднанай універсальнай бібліятэкі 1983—1992 гг.” (1993 г.) і рэпертуарам мясцовых выданняў “Выдадзена ў Гомельскай вобласці” і паказальнікам іх складу, выпуск якіх запланаваны Гомельскай абласной бібліятэкай у рамках абласной краязнаўчай праграмы “Жывая памяць Гомельшчыны”.

Такім чынам, аналіз сістэмы рэгіянальных бібліяграфічных дапаможнікаў абласных бібліятэк Беларусі дазволіў нам зрабіць наступныя вывады. Неабходна ўдзяляць увагу стварэнню асноўных сістэмастваральных звёнаў: навукова-дапаможных універсальных паказальнікаў краязнаўчых дакументаў (бягучых і рэтраспектыўных) і агульных зводных каталогаў (рэпертуараў) мясцовых дакументаў і паказальнікаў іх зместу. Больш увагі патрабуе стварэнне навукова-дапаможных шматгаліновых, галіновых і тэматычных паказальнікаў, якія б адпавядалі спецыфіцы развіцця канкрэтных рэгёнаў. Найбольш распаўсюджаны ў нас біябібліяграфічныя паказальнікі. Пры гэтым больш увагі надаецца “землякам” рэгіёна і менш адлюстроўваюцца яго “дзеячы”. Амаль зусім не складаюцца паказальнікі краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў. Найбольш станоўчы вопыт у гэтым плане мае Гомельская абласная бібліятэка. Неабходна выпускаць рэкамендацыйныя рэтраспектыўныя паказальнікі “Што чытаць аб краі”.

Сярод рэкамендацыйных тэматычных краязнаўчых паказальнікаў, мабыць, варта звярнуць увагу на тэмы, якія прыцягваюць найбольшую ўвагу грамадства, улічваючы рэгіянальную спецыфіку — экалогія, эканоміка, народныя рамёствы і інш. Далейшага развіцця патрабуе накірунак стварэння паўнацэннай падсістэмы бібліяграфічных паказальнікаў мясцовых выданняў, у склад якіх уваходзілі б не толькі паказальнікі кніг перыядычных выданняў, што выдаваліся ў рэгіёне, але і іншых відаў выданняў, аўдыёвізуальных дакументаў. Стварэнне паўнацэннай сістэмы рэгіянальных бібліяграфічных дапаможнікаў забяспечыць карыс-

тальнікам выхад у рэгіянальную інфармацыйную прастору. Аўтаматызацыя бібліяграфічных працэсаў, рэалізацыя краязнаўчых абласных праграм "Жывая памяць Гомельшчыны", "Памяць Міншчыны", стварэнне інфармацыйнай аўтаматызаванай сеткі "Магілёўская вобласць" ужо ў бліжэйшы час робяць гэтую мэту рэальнай і даюць магчымасць гаварыць, па словах В.А.Факеева, аб "постбібліяграфічным перыядзе" рэгіянальнай бібліяграфіі.

**Петушко Н.Я.,**
суіскальнік кафедры
бібліятэказнаўства

## БІБЛІЯТЭЧНА-ІНФАРМАЦЫЙНАЕ АБСЛУГОЎВАННЕ НЕВІДУШЧЫХ У РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

Кардынальныя змены, якія адбываюцца ў жыцці нашай рэспублікі, прадугледжваюць творчае разуменне разнастайных працэсаў, звязаных з бібліятэчнай справай, і засяроджванне на яе недастаткова распрацаваных праблемах. Да ліку апошніх належаць пытанні, звязаныя з абслугоўваннем асоб з абмежаванымі магчымасцямі.

Спецыяльныя і публічныя бібліятэкі ў наш час павінны ўваходзіць у лік сацыяльных інстытутаў, якія гарантуюць рэалізацыю законнага права інвалідаў на атрыманне імі інфармацыі. Так, у заканадаўчых актах аб развіцці бібліятэчнай справы прадугледжана арганізацыя спецыяльнага абслугоўвання асоб з фізічнымі абмежаваннямі (Канцэпцыя развіцця бібліятэчнай справы ў Рэспубліцы Беларусь, 1992; закон Рэспублікі Беларусь"Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь", 1995, Палажэнне аб арганізацыі сеткі бібліятэк Рэспублікі Беларусь", 1993; Тыпавыя правілы карыстання бібліятэкамі ў Рэспубліцы Беларусь, 1996). Аднак у сучасную пару існуюць вялікія цяжкасці ў далучэнні асоб з абмежаванымі магчымасцямі да бібліятэкі.